# Слова ад «Дзеяслова»

Шаноўныя чытачы!

У мінулым нумары «Дзеяслова» быў надрукаваны артыкул-расповед пра тое, як пісалася і распаўсюджвалася знакамітая паэма «Сказ пра Лысую гару», што ўвайшла ў беларускую літаратуру як ананімная, і над разгадкай аўтарства якой працаваў не адзін даследчык. Згадкі былі падпісаныя псеўданімам Францішак Вядзьмак-Лысагорскі і, як з іх вынікала, перададзеныя рэдакцыі адным з удзельнікаў стварэньня паэмы. Так, адным з ..., бо тэкст сьведчыў, што над паэмай працавала два творцы. «Дзеяслоў» захаваў ананімнасьць аўтара публікацыі, паабяцаўшы ў наступным нумары даць успаміны-прызнаньне таго, хто ў тых згадках называўся «таварышам», каб тым самым паспрабаваць канчаткова зьняць праблему і аўтарства, і псеўданіма. Зразумела, перад першай публікацыяй «Дзеяслоў» правёў перамовы з «таварышам» і заручыўся ягоным абяцаньнем надрукаваць свае ўспаміны ў нашым часопісе, пра што мы і паведамілі ў прадмове чытачам.

Якім жа было нашае зьдзіўленьне, калі мы ўбачылі абяцаны «Дзеяслову» (дарэчы, ініцыяваны «Дзеясловам» і, што граху таіць, мажліва, і справакаваны «Дзеясловам») артыкул-прызнаньне ў газеце «Народная воля»... Нам прыкра і балюча, што так здарылася. Сваё слова мы прывыклі трымаць, але, на жаль, ня ўсё залежыць ад нас... Тым ня менш, просім у Вас прабачэньня і надалей абяцаем быць больш абачлівымі і прадбачлівымі нават у дачыненьнях з «мэтрамі».

Такім чынам, прызнаньне зьявілася, хай сабе і не ў «Дзеяслове». З яго таксама вынікае, што ў напісаньні і распаўсюдзе паэмы «Сказ пра Лысую гару» ўдзельнічалі два паэты. Назавем іх імёны — Мікола Аўрамчык і Ніл Гілевіч. Так, нататкі ў «Дзеяслове», што выйшлі пад псеўданімам Францішак Вядзьмак-Лысагорскі, былі напісаныя менавіта Міколам Аўрамчыкам яшчэ ў 1991 годзе як тастамант, а ў «Народнай волі» Ніл Гілевіч надрукаваў прызнаньне ў аўтарстве «Сказу...» пад сваім імем... Цяпер ужо справа літаратуразнаўцаў (і саміх Міколы Аўрамчыка ды Ніла Гілевіча) разабрацца ў ролі (укладзе і ўдзеле) кожнага ў стварэньні паэмы і, адпаведна, прызнаць псеўданім «Францішак Вядзьмак-Лысагорскі» калектыўным, альбо прыналежным аднаму Нілу Гілевічу (у «Народнай волі» ён, «аддаючы належнае» Міколу Аўрамчыку, адназначна называе сябе аўтарам, а паэму «сваёй» і абяцае надрукаваць у зборы твораў).

«Дзеяслоў» ня хоча і ня будзе ўмешвацца ў літаратуразнаўчыя і тым болей маральна-этычныя спрэчкі. Распачынаючы працу над раскрыцьцём таямніцы аўтарства «Сказу...» і псеўданіма «Францішак Вядзьмак-Лысагорскі», «Дзеяслоў» хацеў толькі паспрыяць справядлівасьці і, здагадваючыся, што мажлівы аўтар паэмы яшчэ жывы, аддаць належнае яго неаспрэчнаму таленту і грамадзянскай мужнасьці... Мы і ня думалі, што гэта можа скончыцца па-залітаратурным скандалам... Сёньня ж відавочна, што журналістаў і «абывацеляў» больш цікавіць ня столькі сама паэма і не яе аўтар(ы), колькі мітрэнгі ды звадкі, што пачаліся вакол «прызнаньня(ў)».

«Дзеяслоў» яшчэ раз просіць прабачэньня ў сваіх чытачоў, а таксама ў... аўтара(ў) і першараспаўсюдніка(ў) паэмы. «Дзеяслоў» гатовы прадаставіць свае старонкі, дзеля вытлумачэньня ўсіх акалічнасьцяў напісаньня паэмы. Калі гэта ўвогуле мажліва...

# Нашыя аўтары

**Акулін Эдуард** — паэт, перакладчык, бард. Аўтар кніг паэзіі «Лес дзённага асвятлення», «Пяшчота ліўня», «Крыло анёла», «Радно», драматычнай містэрыі «На Каляды» і інш. Нарадзіўся ў 1963 г. у в.Вялікія Нямкі на Веткаўшчыне. Жыве ў Менску.

**Аркуш (Козік) Алесь** — паэт, празаік, крытык, выдавец. Аўтар кніг «Вяртанне», «Тайніца», «Крылы ператворацца ў карэньні», «Разьвітаньне з Танталам» і інш. Нарадзіўся ў 1960 г. у Жодзіне. Жыве ў Полацку.

**Арлоў Уладзімер** — празаік, паэт, эсэіст, гісторык. Аўтар кніг «Добры дзень, мая шыпшына», «Дзень, калі ўпала страла», «Рэквіем для бензапілы», «Фауна сноў», «Сны імператара», «Краіна Беларусь», «Ордэн Белай мышы», «Адкусі галаву вароне» і інш. Нарадзіўся ў 1953 г. у Полацку. Жыве ў Менску.

**Багданава Галіна** — празаік, мастацтвазнаўца. Аўтар кніг прозы «Папяровыя замкі», «Чалавек без адраса», «Дом іхняе мары». Нарадзілася ў 1961 г. у Крычаве на Магілёўшчыне. Жыве ў Менску.

**Барадулін Рыгор** — народны паэт Беларусі. Паэт, перакладчык, эсэіст. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі імя Янкі Купалы (1976 г.). Аўтар кніг паэзіі «Маладзік над стэпам», «Рунець, красаваць, налівацца!», «Нагбом», «Адам і Ева», «Рум», «Вечалле», «Евангелле ад мамы» і інш. Нарадзіўся ў 1935 г. у в.Верасоўка на Ушаччыне. Жыве ў Менску.

**Быкаў Васіль** — народны пісьменьнік Беларусі. Празаік, публіцыст. Лаўрэат шматлікіх дзяржаўных і міжнародных літаратурных прэміяў. Аўтар кніг «Жураўліны крык», «Трэцяя ракета», «Альпійская балада», «Воўчая зграя», «Пайсці і не вярнуцца», «Знак бяды», «Кар'ер», «Сьцяна», «Пахаджане», «Доўгая дарога дамоў» і інш. Нарадзіўся ў 1924 г. у в.Бычкі на Ушаччыне. Памёр у 2003 г.

**Гібок-Гібкоўскі Алесь** — публіцыст, паэт. Лаурэат прэміі Беларускага саюза журналістаў «Залатое пяро» (1999 г.),Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (2001 г.). Аўтар шматлікіх публікацыяў у літаратурна-мастацкіх выданьнях. Нарадзіўся ў 1952 г. у в. Рупейкі на Ваўкавышчыне. Жыве ў Менску.

**Гіль (Гілевіч) Мікола** — празаік, перакладчык, публіцыст. Аўтар кніг прозы і публіцыстыкі «Ранішнія сны», «Пуд жыта», «Ёсць на зямлі крыніца» «Тэлеграма з Кавалевіч», «Пасеянае – узыдзе», «Камандзіроўка ў Вішанькі», «Кім і Валерыя» і інш. Нарадзіўся ў 1936 г. у в.Слабада на Лагойшчыне. Жыве ў Менску.

**Грышкевіч Сяргей** — крытык, літаратуразнаўца, празаік. Рэцэнзіі і апавяданьні друкаваліся ў «Народнай волі», «Чырвонай змене», «Звяздзе», «ЛіМе», «Маладосці» і інш. Нарадзіўся ў 1980 г. у Берасьці. Жыве ў Берасьці

**Дранько-Майсюк Леанід** — паэт, празаік, эсэіст, перакладчык. Аўтар кніг «Вандроўнік», «Тут», «Над пляцам», «Акропаль», «Стомленасць Парыжам» і інш. Нарадзіўся ў 1957 г. у Давыд-Гарадку. Жыве ў Менску.

**Дашчынскі Алесь** — журналіст, публіцыст. Працаваў на Беларускім радыё. З 1994 г. – аглядальнік газеты «Свабода», потым газеты «Навіны». З 2000-га па 2002 г. быў карэспандэнтам «Радыё Рацыя». Нарадзіўся ў 1961 г. у в. Груздава на Пастаўшчыне. Жыве ў Менску.

**Жакмэн Франсуа** — бельгійскі паэт. Аўтар кніг «Шэрае даміно», «Поры года» і інш. Нарадзіўся ў 1929 г. у мястэчку Хесбінён пад Льежам. Памёр у 1992 г.

**Казарын Уладзімір** — публіцыст, літаратуразнаўца, доктар філалагічных навук. Аўтар больш за 450 публікацыяў, у тым ліку 30 кніг і падручнікаў. Нарадзіўся ў 1952 г. у Ашхабадзе. Жыве ў Сімферопалі.

**Камінская Зараслава** — празаік. Студэнка першага курсу журфаку БДУ. Нарадзілася ў 1985 г. у Наваполацку. Жыве ў Менску.

**Камоцкі Алесь** — паэт, бард. Аўтар кнігі паэзіі «Спроба ісьці па расе», магнітаальбомаў «Першы сшытак», «Я табе...», «Дым» і інш. Нарадзіўся ў 1958 у г. Барысаве. Жыве ў Менску.

**Качаткова (Сьцепаненка) Паліна** — празаік, публіцыст, журналіст. Апавяданьні друкаваліся ў «ЛіМе», «Крыніцы», «Нашай ніве» і інш. выданьнях. Нарадзілася ў 1968 г. у Оршы. Жыве ў Менску.

**Кудасава Наста** — паэтка. Студэнтка філфаку БДУ. Нарадзілася ў 1982 г. у Полацку. Жыве ў Менску.

**Кісьліцына Ганна** — крытык, літаратуразнаўца. Аўтар кніг «Алесь Разанаў. Праблемы мастацкай свядомасці», «Лірычная мініяцюра як жанр беларускай літаратуры», «blonde-attack». Нарадзілася ў 1967 г. у Менску. Жыве ў Менску.

**Кудравец Анатоль** — празаік, перакладчык, эсэіст. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа (1986 г.). Аўтар кніг прозы «Зімы і вёсны», «На зялёнай дарозе», «Раданіца», «Сачыненне на вольную тэму», «Сьмерць нацыяналіста» і інш. Нарадзіўся ў 1936 г. у в. Аколіца на Клічаўшчыне. Жыве ў Менску.

**Лецка Яўген** — празаік, перакладчык, публіцыст, літаратуразнаўца. Аўтар кніг «Па цаліку», «Дарога ў два канцы», «Харастве і боль жыцця» і інш. Нарадзіўся ў 1944 г. у в.Пабрэзьзе на Навагрудчыне. Жыве ў Менску.

**Майрынк Густаў** (Густаў Майер)— аўстрыйскі празаік . Раманы «Голэм» (1915 г., бел. пер. гл.: «Крыніца», 1998, №4-6), «Зялёны твар» (1917 г.), «Ноч Вальпургіі» (1917 г.), «Белы дамініканец» (1921 г.) належаць да класікі фантастычнай літаратуры. Нарадзіўся ў 1868г. Памёр у 1932 г.

**Мамчыч Алеся** — паэтэса. Лаўрэат украінскага паэтычнага фестывалю «Маладое віно» (2001 г.). Нарадзілася ў 1981 г. у Кіеве. Жыве ў Кіеве.

**Мацяш Ніна** —паэтэса, драматург, перакладчыца. Лаурэат прэміі імя А.Куляшова (1984 г. ). Аўтар кніг «Агонь», «Удзячнасць», «Прыручэнне вясны», «Поўны келіх», «Жнівень»,«Шчаслівай долю назаві...», «Перабіраю самацветы» і інш. Нарадзілася ў 1943 г. у в.Нівы на Бярозаўшчыне. Жыве ў Белаазёрску.

**Міхно Уладзімір** — празаік, публіцыст. Аўтар кніг «Горкі зефір» і інш. Нарадзіўся ў 1964 г. у в. Чэрцы на Лепельшчыне. Жыве на Лепельшчыне.

**Наталіч Марына (Натальля Давыдзенка)** — паэт, празаік. Аўтар зборнікаў вершаў «Странники», «Первые стихи», прозы «Глухие голоса». Нарадзілася ў 1950 г. у г.Ваніна на Далёкім Усходзе. Жыве ў Менску.

**Някляеў Уладзімір** — паэт, празаік, эсэіст. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Янкі Купалы (2000 г.). Аўтар кніг паэзіі «Адкрыццё», «Вынаходцы вятроў», «Наскрозь», «Прошча» і інш. Нарадзіўся ў 1946 г. у Смаргоні на Гродзеншчыне. Зараз жыве ў Фінляндыі.

**Пацюпа Юрась** — паэт, празаік, крытык. Аўтар кнігі паэзіі «Ноч». Нарадзіўся ў 1965 г. у Полацку. Жыве ў Менску.

**Рагойша Вячаслаў** — крытык, літаратуразнаўца, доктар філалагічных навук. Аўтар кніг «Паэтыка Максіма Танка: Культура вобраза. Характар верша», «Пераклаў Якуб Колас...», «Карані дружбы», «Гутаркі пра верш», «Кантакты» і інш.Нарадзіўся ў 1942 г. у в.Ракаў на Валожыншчыне. Жыве ў Менску.

**Рублеўская Людміла** — паэт, празаік, крытык, драматург, нарысіст. Аўтар кніг паэзіі «Крокі па старых лесвіцах», «Адукацыя», «Замак месячнага сяйва», прозы «Міфы горада Б'», «Сэрца мармуровага анёла» і інш. Нарадзілася і жыве ў Менску.

**Сёмуха Васіль** — перакладчык. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1992 г.). За перакладчыцкую дзейнасьць адзначаны найвышэйшымі ўзнагародамі Латвіі і Нямеччыны. Перакладае з нямецкай, польскай, украінскай і інш. моваў. Пераклаў на бел. мову «Найвышэйшую песьню Саламонаву», «Новы запавет. Псалтыр», «Біблію». Нарадзіўся ў 1936 г. на хутары Ясенец на Пружаншчыне. Жыве ў Менску.

**Сідарэвіч Анатоль** — публіцыст, філосаф, літаратуразнаўца, крытык. Аўтар кнігі «Луцкевічы і Луцэвічы». Адзін з ідэолагаў адроджанай беларускай сацыял-дэмакратыі. Нарадзіўся ў 1948 г. на хутары Доўгі Лес на Піншчыне. Жыве ў Менску.

**Сіўчыкаў Уладзімір** — паэт, празаік, публіцыст, перакладчык, драматург, мастак. Аўтар кніг «Гульня ў тастамант» і «Лісты да брата». Нарадзіўся ў 1958 г. у Жодзіне. Жыве ў Менску.

**Скобла Міхась** — паэт, парадыст, перакладчык, эсэіст. Лаўрэат літаратурнай прэміі імя Алеся Адамовіча (2000 г.). Аўтар паэтычных кніг «Вечны Зьніч», «Вочы Савы», «Нашэсьце Поўні», кнігі гістарычных нарысаў «Дзярэчынскі дыярыюш» і інш. Нарадзіўся ў 1966 г. у в. Паляжын на Зэльвеншчыне. Жыве ў Менску.

**Сокалаў-Воюш Сяржук** — паэт, бард, перакладчык, журналіст. Аўтар кнігі паэзіі «Кроў на сумётах». Нарадзіўся ў 1957г. у в.Астроўшчына на Полаччыне. Жыве ў Чэхіі.

**Сом Лера (Алена)** — паэт, празаік. Аўтар кніг паэзіі «Блюз каралеўскае кухні», «Адзінокая зорка». Нарадзілася ў 1966г. у Полацку. Жыве ў Полацку.

**Федарэнка Андрэй** — празаік, драматург. Лаўрэат літаратурнай прэміі імя Івана Мележа. Аўтар кніг прозы «Гісторыя хваробы», «Сінія кветкі», «Шчарбаты талер», «Афганская шкатулка». Нарадзіўся ў 1964 г. у в. Бярозаўка на Мазыршчыне. Жыве ў Менску.

**Хадановіч Андрэй** — паэт, перакладчык, літаратуразнаўца. Перакладае з ангельскай, французскай, польскай і ўкраінскай моваў. Аўтар кніг паэзіі «Лісты з-пад коўдры» (у перакладзе на ўкраінскую мову), «Старыя вершы». Нарадзіўся ў 1973 г. у Менску. Жыве ў Менску.

**Хурсік Віктар** — публіцыст, журналіст. Аўтар кніг «Белы лебедзь у промнях славы», «Трагедыя белай гвардыі», «Кроў і попел Дражні». Нарадзіўся ў 1953 г. у на чыгуначнай станцыі Уборак на Асіповіччыне. Жыве у Менску.

# Summary

Belarus suffered a tremendous loss, when the world-famous writer Vasil Bykaú deceased on June 22, 2003. To commemorate the Great Son of his Motherland, *DZIEJASŁOÚ* opens with a number of works dedicated to Vasil Bykaú, which include poems *He Will Be Called* by Rimma Kazakova, *The Conscience* by Zielimcha Jandarbi, and *To Make Earthly Life a Bit Warmer* by his close friend the People's Poet of Belarus Ryhor Baradulin. Anatol Kudraviec, ex-editor-in-chief of *The Nioman*, shares his memories of Vasil Bykaú in *The Cross of Time*, while poet Siaržuk Sokałaú-Vojuš pays tribute to Vasil Bykaú in his essay *The Torment Field*. Siarhiej Hryckievič, a young critic from Bieraście, analyses Vasil Bykaú's short stories from *The Wall* and parables from *The Vagabonds*. And you will also find here *Apologia for Integration*, a pamphlet by Vasil Bykaú, which has never been published in Belarus before.

As usual, *DZIEJASŁOÚ* offers you a wide range of contemporary Belarusian poetry. Thus, Uładzimir Niaklajeú introduces *The Serpent God*, Uładzimier Arłoú brings *A Bunch of Golden Immortelles*, Ludmiła Rubleúskaja contemplates *Between Buffoonery and Reality*, Aleś Kamocki says, *I Know It Will Get Cold*, Maryna Natalič claims *Love Is Deeper than Hatred*, Andrej Chadanovič has his *Genius Locked in a Boat*, while Nasta Kudasava, philology student of the Belarusian State University, makes her debut praying, *God, Give Me September!*

As for prose, it is represented by Leanid Drańko-Majsiuk's *Aúdolka and Michałka*, Mikoła Hil's *I Used to Have Magnate*, Andrej Fiedarenka's *Graffiti*, Juraś Paciupa's *Scattered Chestnuts*, *The Grey Well* by Uładzimir Michno, *Nocturnal Conversations about Butterflies* by Palina Kačatkova and *To Love Belarus*, a debut piece by a Navapołacak schoolgirl Zarasłava Kaminskaja.

In the *Translations* section you can read *Poems Have Turned into Tumble-weep* by Ukrainian poet Alesia Mamčyč, rendered into Belarusian by Michaś Skobła and Eduard Akulin, the renowned François Jacquemin poems from *The Seasons*, as well as *The Man on the Bottle* by the Austrian classic Gustav Meyrink, translated respectively by Nina Maciaš and Vasil Siomucha.

*DZIEJASŁOÚ* has quite a lot of social writings and literary criticism in stock. Thus, Aleś Hibok-Hibkoúski comes up with *Is It Still a Long Way to Belarus?*, a contribution with a meaningful subheading, *Will Belarus pass her exam in independence?* Hanna Kiślicyna has had a talk with young avant-garde poet Andrej Chadanovič, the interview given under the title *I Consider It My Task to Break Stereotypes.* Vladimir Kazarin, researcher from the Crimea, discusses the issues of protecting and preserving languages of minor ethnic groups in *Globalisation and Maintaining Linguistic Diversity in the Modern World.* Meanwhile, Jaúhien Lecka endeavours *To Unveil* the practices of using the national symbols during the 2nd World War and Viktar Chursik features the plight of Belarusians who took Napoleon's side and joined the French army in the war of 1812 (see *They Were in Full Retreat towards Paris*). In his contribution *With a Noose on His Neck* Aleś Daščynski remembers Ihar Hiermiančuk, the untimely deceased editor-in-chief of *Svaboda*, the first independent Belarusian paper of our time, while *Połacak Lives on Literature* by Aleś Arkuš marks the 80th anniversary of the legendary literary society *Maładniak*.

Halina Bahdanava gives the profile of Tamara and Uładzimir Vasiuk, a family of artists, whose pictures among other things adorn *DZIEJASŁOÚ*'s cover (see *The Duet*).

It is a good tradition to conclude an issue with reviews of recently published books. This time Anatol Sidarevič in his article *The Expected and the Unexpected* analyses the sketches by Janka Bryl, while Lera Som evidently took inspiration to write *What Poems Are Made From* in *The Wine from California* by Valancina Aksak. And last but not least, Uładzimir Siúčykaú gives his appreciation of *The 20th Century Great Writers* in *The Maths Lesson*.

Да ведама аўтараў:
рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.

Рэдакцыя не нясе адказнасьці
за выкладзеныя ў аўтарскіх тэкстах факты.

Пры перадруку
спасылка на «Дзеяслоў» абавязковая.

У «Дзеяслове» скарыстаныя фотаздымкі:
Кастуся Дробава, Уладзіміра Крука,
Віктара Стралкоўскага.

**Рэдакцыя:**
Барыс Пятровіч (Сачанка) — галоўны рэдактар,
Эдуард Акулін, Алесь Пашкевіч, Міхась Скобла.

Пасьведчаньне аб рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі
№ 2073 ад 23 красавіка 2003 г.

Выдавец — РГА «Літаратурна-мастацкі фонд «Нёман».
Юрыдычны адрас: вул. Кузьмы Чорнага, 18-2, 220012, г. Менск.

Ілюстрацыі на вокладцы — Уладзіміра Васюка.
На 1-й стар.: «Еднасьць»,
на 4-й стар.: «Чаша».

© Генадзь Мацур, мастацкае афармленьне, 2003

Адрас рэдакцыі:
220089 г. Менск-89, а/с 73
e-mail: dzieja@tut.by, dzieja@list.ru

Здадзена ў набор 10.08.2003 г.
Падпісана да друку 31.08.2003 г.
Фармат 70х108 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Друк афсетны.
Аб'ём — 22 ул.-выд. арк.
Наклад 1000 асобнікаў.
Заказ №

Надрукавана ў друкарні УП "Тэхнапрынт" ЛП №203.
Мінск, пр-т Скарыны, 65, корп. 14, оф. 215.

Кошт нумару – па дамове.